# ШТО ЗБІРАЦЬ ДЛЯ ПЕРАПРАЦОЎКІ?

Пластык, шкло, паперу, кардон, метал, зношаныя шыны, батарэйкі, акумулятары, нерабочае электроннае і электрычнае абсталяванне, лямпы.



## ШКЛО



Бутэлькі і слоікі павінны быць пустымі, этыкеткі здымаць не трэба.

## ПАПЕРА



Ачысціце паперу і кардон ад пластыкавых і буйных металічных элементаў. Каробкі складзіце максімальна кампактна. Тэтрапак-упакоўку сцісніце, зніміце крышкі.

## МЕТАЛ



Металічную тару цалкам ачысціце ад змесціва. Можна крыху спаласнуць вадой. Этыкеткі здымаць не абавязкова.

## ПЛАСТЫК



Пластыкавыя бутэлькі сцісніце. Крышкі закруціць на бутэльцы. Звяртайце ўвагу на маркіроўку пластыка.

3 PVC/V, 7 OTHER — Не прымаецца на перапрацоўку аднаразовы посуд, камбінаваная ўпакоўка (дой-пак або пауч-упакоўка ад кетчупаў, соусаў, кармоў для хатніх жывёл, дзіцячага пюрэ), кантэйнеры для ежы "на вынас" і латкі для прадуктаў з успененага полістыролу.

1 PETE, 2 HDPE, 4 LDPE, 5 PP — Прымаецца на перапрацоўку

6 PS — Цяжка перапрацаваць

# КУДЫ ВЫКІДВАЦЬ?

# ВАРЫЯНТЫ АРГАНІЗАЦЫІ СІСТЭМЫ ЗБОРУ І ВЫВАЗУ АДХОДАЎ

## 1

### КАНТЭЙНЕР ДЛЯ ДМР

Для змешаных другасных матэрыяльных рэсурсаў: адходаў шкла, паперы, пластыку, металу.



### КАНТЭЙНЕР ДЛЯ ЦКА

Для цвёрдых камунальных адходаў: для змешанага смецця, якое не падлягае раздзельнаму збору.




## 2

### КАНТЭЙНЕР ДЛЯ АДХОДАЎ ПАПЕРЫ

Для кардонных каробак, папяровых фасовачных пакетаў, старых газет, часопісаў, рэкламных праспектаў, школьных сшыткаў, блакнотаў, офіснай паперы, упакоўкі ад сокаў, малочных прадуктаў тыпу тэтрапак (маркіроўка C/PAP).



### КАНТЭЙНЕР ДЛЯ АДХОДАЎ ПЛАСТЫКУ

Для ПЭТ-кантэйнераў і ПЭТ-бутэлек з-пад вады, напояў, малака, соусаў, масла, упакоўкі са шчыльнага поліэтылену (пакеты, плёнкі), флаконаў для касметыкі, ачышчальных сродкаў, бытавых прадметаў (вёдры, тазікі і т.п.), шкляначак для ёгуртаў і смятаны, шматразовага посуду.



### КАНТЭЙНЕР ДЛЯ АДХОДАЎ ШКЛА

Для шкляных бутэлек і слоікаў, бітага шкла бутэлек і слоікаў.



### КАНТЭЙНЕР ДЛЯ ЦКА

Для цвёрдых камунальных адходаў: для змешанага смецця, якое не падлягае раздзельнаму збору.



## ЭЛЕМЕНТЫ СІЛКАВАННЯ



Батарэйкі і акумулятары адносьце у спецыяльныя кантэйнеры, размешчаныя ў грамадскіх месцах, або здавайце у прыёмныя пункты арганізацый, якія займаюцца зборам такіх адходаў.

## ЭЛЕКТРОННАЕ І ЭЛЕКТРЫЧНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ



Бытавую і камп’ютарную тэхніку, мабільныя тэлефоны, планшэты, і іншыя гаджэты здавайце ў спецыяльныя кантэйнеры для дробнай тэхнікі, якія знаходзяцца ў магазінах, або ў пункты прыёму спецыялізаваных арганізацый.

Для вывазу буйной бытавой тэхнікі на перапрацоўку даступна паслуга з выездам на ваш адрас.

## ЛЯМПЫ



Люмінесцэнтныя (ртуцьзмяшчальныя), святлодыёдныя і галагенныя лямпы здавайце ў спецыяльныя кантэйнеры, размешчаныя ў месцах продажу або пунктах прыёму.

Лямпы, якія выйшлі са строю, забараняецца выкідваць у агульнае бытавое смецце.

## ЗНОШАНЫЯ ШЫНЫ



Пакідайце зношаныя шыны на СТА, дзе рабілася іх замена, або дастаўляйце ў найбліжэйшы пункт прыёму другаснай сыравіны.

Дапушчальна размясціць зношаныя шыны на пляцоўцы для збору буйнагабарытных адходаў.

## СМЕЦЦЯВОЗ ЗАГРУЖАЕ Ў АДЗІН КУЗАЎ ДРУГАСНУЮ СЫРАВІНУ І АГУЛЬНАЕ СМЕЦЦЕ?

## ГЭТА ГРУБАЕ ПАРУШЭННЕ!

ДАШЛІЦЕ СКАРГУ Ў АДЗІНУЮ СЛУЖБУ НА САЙЦЕ 115.БЕЛ АБО ПАТЭЛЕФАНУЙЦЕ ПА НУМАРЫ 115




КАРТА ПУНКТАЎ ПРЫЁМУ ДРУГАСНАЙ СЫРАВІНЫ

УСЁ АБ САРТАВАННІ АДХОДАЎ НА САЙЦЕ ЦЕЛЬ99.БЕЛ

АПЕРАТАР ДМР дзяржаўная ўстанова

МЭТА

# ЯК САРТАВАЦЬ БЫТАВЫЯ АДХОДЫ



АПЕРАТАР ДМР дзяржаўная ўстанова

МЭТА